нар. казак «Незвычайны асілак» (1961), асобныя творы М.Прышвіна, Ю.Казакова і інш.

*Тв.*: Выбр. творы. Т. 1—2. Мінск, 1983; Голас крыві брата твайго. Мінск, 1990; Нязрушаны камень. Мінск, 2002.

*Літ.*: Л е ц к а Я. Хараство і боль жыцця: нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка. Мінск, 1985; К а в а л е н к а В.А. Вячаслаў Адамчык // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. Мінск, 2002. Т. 4, кн. 1; Ш ч у к а Ю. «Вочы поўныя жыцця...»: (малая проза Вячаслава Адамчыка) // Полымя. 2005. № 4.

**АДАПТАВА́НАЕ ВЫДА́ННЕ**, скарочанае або спрошчанае выданне літаратурнага твора або навук. працы для непадрыхтаванага чытача. Адаптуюцца творы для пачатковага чытання, кнігі для дзяцей, падручнікі (напр., для вывучэння мовы іншаземцамі або замежнай мовы мясц. жыхарамі) і інш. У 1929 выйшаў у свет скарочаны пераклад на бел. мову кн. У.Арсеньева «У нетрах Усурыйскага краю» (пер. М.Гарэцкага). У 1956 Дзярж. выд-ва БССР выпусціла ў перакладзе М.Машары карэлафінскі эпас «Калевала», пераказаны А.Любарскай для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту. У 1990-я гг. мінскае выд-ва «МЕТ» выпускала А.в. для дзяцей у серыях «Мая першая бібліятэка» і «Кніжка-расфарбоўка».

*А.А.Суша.*

**АДАПТА́ЦЫЯ** (ад лац. adaptare прыстасаваць), прыстасаванне індывіда або групы, сацыяльна-эканам. сістэмы і яе адмысловых суб'ектаў да зменлівых умоў вонкавага асяроддзя, жыцця, працы. Эвалюцыя адаптыўных рэакцый з'яўляецца адной з базавых характарыстык развіцця форм жыцця. На архаічных этапах гіст. развіцця асн. фактарам А. з'яўляецца комплекс прыродных умоў існавання. На этапе раннекласавых цывілізацый узрастае значэнне А. да гіст. умоў (абмен прадуктамі, ідэямі і барацьба за тэрыторыі, рэсурсы, паліт. і рэліг. дамінаванне). На індустрыяльнай і постіндустрыяльнай стадыях прыярытэтнай становіцца А. да патрабаванняў устойлівага ўзнаўлення эканомікі і яе рэсурснага забеспячэння, да асаблівасцей штучнага асяроддзя жыццядзейнасці людзей. А. індывіда, як правіла, пачынаецца з *акультурацыі*, засваення новых стэрэатыпаў успрымання і паводзін і можа прывесці да асіміляцыі, страты б. культ. каштоўнасцей, узораў, норм. Эмігранты праходзяць сац. А., якая патрабуе адпаведнага новай сітуацыі змянення асобных светапоглядных культ. установак і каштоўнасцей, характару і стылю жыцця, асваення новых сац. роляў. У гэтым выпадку А. становіцца рэсацыялізацыяй (паўторнай сацыялізацыяй). Важны момант А. заключаецца ва ўзгадненні сваіх патрэб і дамаганняў з рэальнымі магчымасцямі акружэння. Пераезд з вёскі ў горад, у інш. краіну дапускае, што прыйдзецца адмаўляцца ад уладкаванага месцапражывання, звыклай работы, трывалых сац. сувязей і адносін. А. становіцца працэсам сац. абмену. Сістэмы з больш высокай мерай А. больш надзейныя, ступень іх выжывальнасці адпаведна вышэйшая. Пытанні А. актуальныя для гіст. і сучаснага развіцця бел. грамадства.

*Літ.*: М а р к а р я н Э.С. Теория культуры и современная наука. М., 1983; К а л а й к о в И.Д. Цивилизация и адаптация. М., 1984; А р у т ю н о в С.А. Народы и культуры: развитие и взаимодействие. М., 1989; Ф л и е р А.Я. Культурогенез. М., 1995.

*В.Р.Языковіч.*

**АДАСО́БЛЕНЫЯ ЧЛЕ́НЫ СКА́ЗА**, даданыя члены сказа, якія выдзяляюцца сэнсава і інтанацыйна з мэтай узмацніць іх значэнне і надаць некаторую самастойнасць. Важнейшай умовай адасаблення з'яўляецца інтанацыя. Яна дазваляе выдзеліць пэўны член сказа ў вуснай мове і падкрэсліць яго ўдакладняльны характар. Акрамя таго, на адасабленне членаў уплываюць іх парадак у сказе, ступень развітасці і сэнсавая нагрузка. У сказе могуць адасабляцца толькі залежныя кампаненты. У іх пазіцыі ўжываюцца азначэнні (атрыбутыўныя адносіны): «У лесе, змярцвелым і суровым, было зацішна і нават цёмна» (І.Шамякін); прыдаткі (апазітыўныя адносіны): «Ён мігцеў, дрыжаў, вясёлы агеньчык» (І.Мележ); дапаўненні (камплектыўныя адносіны): «У хаце, акрамя дзеда, нікога не было» (З.Бядуля); акалічнасці (сітуа-

*С.Адашкевіч. Помнік Ф.Скарыне ў Мінску. 1990.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ